мых на основании правительственных распоряжений, «в духе русской народности и православия» [1, л. 386-392; 2, л. 170–170 об.; 3, л. 1–4].

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Муравьев Михаил Николаевич. Циркуляры, инструкции и распоряжения по военно-гражданскому управлению в Виленской, Ковенской, Гродненско, Минской и Могилевской губ. о борьбе с повстанцами, о подавлении волнений в учебных заведениях и др. (май 1863 г. – февраль 1864 г.) // Отдел рукописей РНБ. – Фонд 629 «Ратч В.Ф.». – Ед. хр. № 172. – 405 л.
2. Циркуляры и предписания начальника губернии (28 мая – 27 июня 1863 г.) // Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. – Фонд 3. – Оп. 1. – Д. 31. – 220 л.
3. Циркуляр Муравьева М.Н. начальникам губерний Виленской, Гродненской, Ковенской, Могилевской и Минской о запрещении преподавания в сельских школах на польском языке (1 января 1864 г.) // Государственный архив Российской Федерации. – Фонд 811. – Оп. 1. – Д. 50. – 4 л.

УДК 93/94:63(476)

# ДАКЛАД ПРАФЕСАРА УСЦЬЯНЦАВА І ПАЧАТАК АНГЕЛЬНСКАЙ «ЛІХАМАНКІ» Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

**Галубовіч В. У., Радзюк А. Р.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Умоўнай датай адліку дадзенай гісторыі можна лічыць 5 чэрвеня 1910 г. У гэты дзень на пасяджэнні *Гарадзенскай Асаблівай Агранамічнай Нарады*, выконваючы абавязкі неадменнага сябра Кобрынскага павета, земскі начальнік П. Ф. Мінкоў і аграном Б. П. Шыраеў унеслі свае прапановы па паляпшэнні якасці буйной рагатай жывелы ў Гарадзенскай губерні. Вынікам абмеркавання стала пастанова нарады аб стварэнні асаблівай камісіі ў складзе васьмі аграномаў (П. Ф. Мінкова, Б. П. Шыраева, Б. Г. Авенарыюса, П. В. Лешчанкі, Л. М. Ярогіна, Б. А. Буха, А. Т. Кірсанава, М. А. Міхно) і пяці землеўласнікаў (І. К. Рота, І. Ф. Банькоўскага, Г. О. Бера, А. А. Азнабішына і Ю. І. Урсын-Нямцэвіча). Мэтай дзейнасці камісіі была распрацоўка рэкамендацый па развіцці жывёлагадоўлі ў губерні. На чале камісіі было прапанавана паставіць прафесара Нова-Аляксандраўскага інстытута сельскай гаспадаркі і лесаводства (НАІСГіЛ) Васіля Паўлавіча Усцьянцава [1, арк. 1]. Да Усцьянцава быў накіраваны адпаведны афіцыйны зварот. Ужо 14 ліпеня на імя гарадзенскага губернатара прыйшоў станоўчы адказ, у якім «*магістр аграноміі*» В. П. Усцьянцаў паведаміў: «*Пакорліва прымаю на сябе агульнае кіраўніцтва працай згаданай Камісіі*», і неўзабаве, г. зн. 27



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ліпеня 1910 г., абяцаў прыехаць у Гародню [1, арк. 3-3 адв.]. З гэтага ж ліста вынікае, што Усцьянцаў на момант свайго абрання кіраўніком спецыялізаванай камісіі не меў дакладнага ўяўлення пра стан справы, за якую ён падпісаўся адказваць: «*Што датычыцца непасрэднай працы Камісіі, то яна можа быць пачата толькі пасля майго азнаямлення з жывёлагадоўляй губерні, пра сучасны стан якой і аб пажаданых мерах па яе паляпшэнні мной будзе прадстаўлены Камісіі даклад*” [1, арк. 3-3 адв.]. Тым не менш зварот да супрацоўніка аўтарытэтнай сельскагаспадарчай установы не быў выпадковасцю. Васіль Паўлавіч Усцьянцаў меў адпаведны тэарэтычны і практычны досвед ды ў вузкім сэнсе з'яўляўся вучоным-зоаінжынерам. Пасля сканчэння ў 1898 г. НАІСГіЛ ён працаваў там жа на кафедры агульнай заатэхніі, а ў 1906 г. абараніў дысертацыю ў Наварасійскім універсітэце па тэме «*Пра харчаванне траваедных жывёл клятчаткай і грубымі кармамі*», больш таго, і наступная кар'ера Васіля Усцьянцава была шчыльна звязана з выкладчыцка-арганізацыйнай і навуковай працай у галіне жывёлагадоўлі [2].

Камісія, найперш, у асобе яе старшыні, пачала дастаткова актыўна працаваць над зборам звестак пра стан жывёлагадоўлі ў губерні. Тут карысна будзе адзначыць, што (згодна з іншымі крыніцамі) на 1910 г. ужо была праведзена сур'езная праца ў гэтым накірунку і нават зроблены рэкамендацыі [3, с. 1]. Але відавочна, што прафесару В. Усцьянцаву былі патрэбныя асабістыя назіранні і агульная верыфікацыя наяўнай інфармацыі. Ужо 27 ліпеня ён павінен быў накіравацца ў аб'езд па губерні з мэтай збору матэрыялаў для свайго даклада перад камісіяй [1, Арк. 6]. Не выклікае сумненняў, што ўласна да гэтага аб'езду была праведзена праца па зборы звестак пра прыватныя гаспадаркі губерні, у якіх праводзілася праца па паляпшэнні пароды хатняй жывёлы. Агульная зводка інфармацыі па гэтым пытанні дастаткова паказальная: сумарна ў васьмі паветах губерні налічвалася 50 маёнткаў (пунктаў), дзе можна было палепшыць пароду буйной рагатай жывёлы. Найбольш іх было ў Ваўкавыскім павеце – 12. У Гарадзенскім павеце такіх маёнткаў было шэсць, у тым ліку ***і Станіслававова, якое належала князю Уладзіславу Аляксандравічу Друцкаму-Любецкаму*** [1, арк. 12-12 адв.]. Пры гэтым было высветлена, што у лепшых гаспадарках Слонімскага павета для паляпшэння пароды буйной рагатай жывёлы выкарыстоўвалі швіцкую і галандскую пароду [1, арк. 11]. Дадзены спіс быў той арыенціроўкай, на падставе якой Усцьянцаў накіраваўся у сваю навуковую экспедыцыю. Садзейнічаць яму, на падставе асобнага пасведчання, былі абавязаны ўсе пасадоўцы і дзяржаўныя ўстановы губерні [1, арк.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

11]. Усцьянцаў паставіўся да сваіх абавязкаў дастаткова адказна: быў складзены маршрут паездак і разасланыя адпаведныя паведамленні. Так, 30 ліпеня 1910 г. раніцай ён павінен быў прыбыць у Беласток, пра што была выслана адпаведная інфармацыя [1, арк. 14]. Фактычна аб'езд быў скончаны 10 жніўня, а 25 жніўня Усцьянцаў меркаваў з'явіцца на сваім працоўным месцы ў Нова-Аляксандраўскім інстытуце [1, арк. 19-20 адв.]. За такі кароткі час, безумоўна, нельга было скласці паўнавартасную статыстычную карціну стану жывёлагадоўлі, пра што сам В. П. Усцьянцаў адзначае ў лісце, дзе  сцвярджаецца, што нават выбарачнае азнаямленне з гаспадаркамі Сакольскага, Беластоцкага, Кобрынскага, Берасцейскага, Слонімскага паветаў дало падставы для прапаноў «*у цэлым*» аб магчымых накірунках дапамогі ў галіне жывёлагадоўлі [1, арк. 19-20 адв.]. Цікава, што паездкі Усцьянцава адсочваліся зверху. Так, у адказе Берасцейскай павятовай землеўладкавальнай камісіі на кантрольны запыт адзначалася, што «*наколькі вядома Камісіі, прафесар ... у Берасцейскім павеце не быў*» [1, арк. 25]. Але з пазнейшага ліста-справаздачы Усцьянцава вынікала, што ён наведаў каля двух дзясяткаў маёнткаў і хутароў, пераважна ў заходняй частцы губерні, у тым ліку і маёнтак Вярховічы ў Берасцейскім павеце, які належаў І. Роту [1, арк. 28].

Вынікі працы прафесара належала прадставіць камісіі, якую меркавалася склікаць на 17 ці 18 верасня 1910 г. [1, арк. 23], хаця сам Усцьянцаў хацеў выступіць пасля 20 верасня [1, арк. 27], тым больш, што ў верасні ён працягваў збіраць неабходны матэрыял [1, арк. 69 адв.]. Цікава, што пры гэтым пачатковая праца не была Усцьянцаву адпаведным чынам кампенсавана нават на пачатку верасня. 4 чысла гэтага месяца ён пісаў між іншым: «*Я не бачу, каб маю працу па паездцы і складанні даклада Землеўладкавальная Камісія мелі намер узнагародзіць*» [1, арк. 27 адв.].

Як бы там не было, але даклад быў зроблены, раздрукаваны і пачаў актыўна пашырацца па губернскіх структурах, якія адказвалі за сельскагаспадарчыя пытанні. Высокае начальства, у тым ліку асабіста гарадзенскі губернатар, выявіла інтарэс у гэтай справе. Усцьяцаў нават атрымаў запыт адносна кошту разнастайных брашурак па жывелагадоўлі, якіх меркавалася ў яго набыць не менш 1000 асобнікаў. Не выключана, што частку гэтай кніжнай прадукцыі павінен быў скласці і даклад самога прафесара [1, арк. 38-38 адв.].

Сам тэкст выступу падрыхтаваны прафесарам Усцьянцавым быў не толькі прачытаны на пасяджэнні Гродзенскай асаблівай агранамічнай нарады, якое адбылося толькі 15 кастрычніка [1, арк. 69], але і спецыяльна надрукаваны ў губернскай друкарні асобным



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

накладам ў тым жа 1910 г. [1, арк. 58-71 адв.]. Змест даклада ў цэлым дастаткова паказальны. Адзначыць трэба, што прафесар не здолеў знайсці падрабязнай і вычарпальнай інфармацыі пра базавыя натуральна-гістарычныя і эканамічныя ўмовы для вядзення жывелагадоўлі ў губерні [1, арк. 59]. Асабістыя яго ўражанні, якія грунтаваліся на выніках аб’езду, зводзіліся да наступнага: «*Вялікая вільготнасць, бедная глеба – пераносяць цяжар вядзення гаспадаркі на жывелагадоўлю і высоўваюць яе на першае месца*» [1, арк. 59]. Далей у дакладзе аналізуюцца дадзеныя Цэнтральнага Статыстычнага Камітэта па структуры размеркавання землекарыстання ў губерні і даецца характарыстыка кармавой базы сялянскіх гаспадарак. Канстатацыя засілля цераспалосіцы і трохполля з аднастайным наборам расліннай культуры прывяла яго да несуцяшальнай высновы: «*Прамым наступствам нізкай тэхнікі паляводства з’яўляецца першабытны стан жывёлагадоўлі ў сялян*» [1, арк. 60 адв]. Асобна ў дакладзе характарызуюцца мясцовыя пароды буйной рагатай жывелы [1, арк. 61-63 адв.].

У якасці галоўных мер па ўдасканальванні жывёлагадоўлі В. П. Усцьянцаў прапаноўваў: *павелічэнне кармавой базы, арганізацыю дробнага крэдытавання і крэдытных таварыстваў на ўзор заходніх краін, утварэнне структур па збыту малочнай прадукцыі, стварэнне жывёлагадоўчых цэнтраў і племярассаднікаў, кваліфікаванае інструктаванне па жывёлагадоўлі і стварэнне кантрольных таварыстваў* [1, арк. 63 адв.-68 адв.].

Сярод практычных крокаў, якія належала неадкладна ажыццявіць, В. П. Усцьянцаў назваў таксама ўдасканаленне мясцовай чырвонай пароды кароў за кошт так званай ***ангельнскай пароды***. Менавіта ***ангельнскай***, а не англійскай, як памылкова сцвярджаецца ў адным з выданняў [4, с. 548]. Гэтыя рэкамендацыі прафесар абгрунтоўваў станоўчым вопытам выкарыстання ангельнскай пароды ў блізкіх па прыродных умовах прыбалтыйскіх губернях, а таксама на вопыце жывёлаводаў Наўгародскай і Пскоўскай губерній [1, арк. 66-66 адв.].

Даклад прафесара В. П. Усцьянцава выклікаў станоўчую рэакцыю ў удзельнікаў нарады, якія ўхвалілі прапановы і «адзінагалосна» пагадзіліся на паляпшэнне пароды мясцовага быдла за кошт ангельнцаў і чыстакроўнай польскай пароды. Было прынята рашэнне аб стварэнні шэрагу злучных пунктаў у вёсках Сухаўляны Гарадзенскага павета, Крыпна-Падухоўнае і Вялікае-Дабрынева Беластоцкага павета, Вялікарыта Берасцейскага павета, Алексеявічы Кобрынскага павета [1, арк. 69 адв.-71].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Гэта пастанова мела даволі заўважную чараду наступстваў. Літаральна па выніках рэкамендацыі пачалася своеасаблівая кампанія па «паляванні» на ангельнцаў па вядомых на той час цэнтрах гадавання племянных быкоў. Захавалася дастаткова паказальнае ліставанне адносна закупкі ангельнцаў у Прыбалтыцы [1, арк. 39-45, 53-57, 76-77]. Дарэчы, кошты ў вытворцаў былі на гэтую пароду дастаткова высокія і вагаліся ў залежнасці ад прадаўца ад 150-250 да 200-400 рублёў [1, арк. 72, 76]. У гарадзенскіх уладаў былі пэўныя ліміты і пажаданні, каб кошт быў да 200 ці некалькі больш за гэтую суму [1, арк. 75]. Аператыўнасці тагачасных чыноўнікаў можна нават пазайздросціць. Так, Слонімскай павятовай землеўладкавальнай камісіі напрыканцы снежня 1910 г. паведамілі, што іх вытворца-бык, ужо набыты ў Рызе, адкульбудзе накіраваны 2 ці 3 студзеня 1911 г. [1, арк. 96].

Ідэі прафесара Усцьянцава хутка набылі папулярнасць на месцах, існаваў нават дэфіцыт быкоў ангельнскай пароды. Так, на пасяджэнні Кобрынскай землеўладкавальнай камісіі ад 14 сакавіка 1911 г. было пастаноўлена набыць ужо пятага па ліку быка «*які, як высветлілася, абыйдзецца даражэй, чым меркавалася*» [1, арк. 120].

Сам набраны тэмп паставак у губерню племянных быкоў быў вельмі паказальны: так, толькі ў спісе набытых напрыканцы мая 1911 г. быкоў для патрэб Гродзенскай землеўладкавальнай камісіі былі пазначаны 8 жывел пад №№ 12-19 [1, арк. 204]. Агульна, па некаторых звестках, у 1911-1913 гг. на тэрыторыю Гарадзенскай губерні было дастаўлена 215 быкоў ангельнскай пароды з Прыбалтыкі і яшчэ 135 чырвонай польскай пароды з Ломжы [3, с. 7]. Размяркоўваліся жывёлы па дастаткова шчыльнай сетцы злучных пунктаў, якія размяшчаліся па ўсіх паветах губерні. Агульна, на 1911 г. набытыя жывёлы павінны былі знаходзіцца ў больш чым 30 населеных пунктах [1, арк. 235].

Праўда, поўнага адзінства ў справе пашырэння ангельнскай пароды ў губерні не было дасягнута. Так, 22 жніўня 1911 г. Слонімская павятовая землеўладкавальная камісія падтрымала прапанову сялян вёскі Булы Косаўскай воласці аб набыцці для іх другога быка пароды Швіц [1, срк. 225-226 адв.], але і гэта не абыйшлося без універсальнага «асобнага меркавання» [1, арк. 227]. Слонімскай камісіі прыйшлося лічыцца з меркаваннем вучонага-аграномa Парыйскага, які прывёў свае доказы на карысць большай мэтазгоднасці ангельнскай пароды: «*Ангельнская парода выведзена ў Шлезвіг-Галшцініі і Усходняй Прусіі – мясцовасцях, якія па кліматычных і батаніка-геалагічных умовах блізка падыходзяць да палескіх, і ў прыватнасці да Гарадзенскай губерні; малочнасць ангельнцаў у сярэднім 200-250 вёдзер вышэй Швіцаў, беднасць летняга балотнага пашавага кармлення і суворае*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*ўтрыманне зімой робяць ангельнаў устойлівымі ў барацьбе за існаванне і здольнымі пераносіць разнастайныя кліматычныя ўмовы … Я цалкам пагаджаюся з дакладам праф. В. Усцьянцава*» [1, арк. 231-232].

На жаль, Першая сусветная вайна і іншыя абставіны не далі магчымасці для паўнавартаснай рэалізацыі праекта В. П. Усцьянцава. Тым не менш на працягу некалькіх гадоў пункты праграмы па паляпшэнні стану жывёлагадоўлі ў сялянскіх гаспадарках Гарадзеншчыны, прапанаваныя прафесарам у 1910 г., заставаліся актуальнымі і часткова былі выкананы: утвораны злучныя пункты і завезены быкі ангельнскай пароды. Сам жа тэкст даклада на сённяшні дзень, несумненна, з'яўляецца, з аднаго боку, першаступеннай па вартасці гістарычнай крыніцай, а з іншага – узорам высокай культуры вучоных мінулых эпох, сведчаннем аўтарытэту навукі, павагі да яе з боку ўлады і грамадства.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гродна. Ф. 868. В. 1. Спр. 50.
2. WWW.UK.WIKIPEDIA.ORG. – Дата доступу 6.02.2019.
3. Гайко, А. А. Красный белорусский скот / А. А. Гайко, С. И. Тузов, М. П. Гринь. – Мн.: Издательство «Ураджай», 1968. – 144 с.
4. Каспяровіч, Г. І. Жывелагадоўля ў маентках // Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Том 1. Культура сацыяльнай эліты XIV - пачатку XX ст. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – С. 529-555.

УДК 811.161

## АНТРОПОНИМЫ *ИВАН И ЯН* И ИХ ПРОИЗВОДНЫЕ В «ПЕРЕПИСИ ВОЙСКА ВКЛ 1528 Г.»

**Голубович О. П.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Ономастикон памятников старобелорусской письменности является источником важной научной информации и будет всегда привлекать отечественных исследователей. Среди таких материалов особое место занимает документация военных переписей 16 в. в Великом княжестве Литовском. Данная статья представляет собой попытку анализа т. н. «пописа» или «переписи» армии ВКЛ в 1528 г. с целью выяснения степени популярности у белоруско-литовской шляхты антропонимов ***Иван и Ян***.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ